**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі
ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
____________________ А.Г. Бахановіч
____________________

Рэгістрацыйны № ____________

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для напрамка адукацыі**
**061 Інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі**
**спецыяльнасцей:**
**6-05-0713-01 Мікра- і нанаэлектроніка**
**6-05-0713-02 Электронныя сістэмы і тэхналогіі**
**6-05-0713-03 Радыёсістэмы і радыётэхналогіі**
**6-05-0717-01 Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы**
**7-07-0713-01 Інфармацыйныя і кіруючыя сістэмы фізічных установак**

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
інфарматыкі і радыёэлектронікі
___________________В.А. Богуш
___________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________С.М. Пішчоў
__________________

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы»
_____________________ І.У. Цітовіч
_____________________

Эксперт-нормакантралёр
_________________
_________________

Мінск 2023

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
В.І.Козел, загадчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
І.В.Наўроцкая, старшы выкладчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», магістр філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт» (пратакол № 10 ад 23.05.2023);
С.І.Фацеева, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай мовы і культуры маўлення ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
Кафедрай агульнаадукацыйных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» (пратакол № 18 ад 10.05.2023);
Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» (пратакол № 2 ад 20.10.2023);
Навукова-метадычным саветам па прыкладных інфармацыйных сістэмах і тэхналогіях Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 2 ад 05.10.2023);
Навукова-метадычным саветам па радыёсістэмах і радыётэхналогіях Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 10 ад 12.06.2023);
Навукова-метадычным саветам па электронных сістэмах і тэхналогіях Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 10 ад 12.06.2023);
Навукова-метадычным саветам па распрацоўцы праграмнага забеспячэння і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 11 ад 12.06.2023);
Навукова-метадычным саветам па мікра- і нанаэлектронай тэхніцы, нанаматэрыялах і нанатэхналогіях Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 2 ад 09.10.2023);
Навукова-метадычным саветам па сістэмах і сетках інфакамунікацый Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 6 ад 16.10.2023);
Навукова-метадычным саветам па інфармацыйнай бяспецы Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне інфарматыкі і радыёэлектронікі (пратакол № 13 ад 29.05.2023).

Адказны за рэдакцыю: С.С.Шышпаронак

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## ХАРАКТАРЫСТЫКА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» распрацавана для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў агульнай вышэйшай адукацыі і прыкладных вучэбных планаў спецыяльнасцей:

6-05-0611-01 Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі,
6-05-0611-02 Інфармацыйная бяспека,
6-05-0611-03 Штучны інтэлект,
6-05-0611-04 Электронная эканоміка,
6-05-0611-05 Кампутарная інжынерыя,
6-05-0611-06 Сістэмы і сеткі інфакамунікацый,
6-05-0612-01 Праграмная інжынерыя,
6-05-0612-02 Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання,
6-05-0612-03 Сістэмы кіравання інфармацыяй,
6-05-0713-01 Мікра- і нанаэлектроніка,
6-05-0713-02 Электронныя сістэмы і тэхналогіі,
6-05-0713-03 Радыёсістэмы і радыётэхналогіі,
6-05-0717-01 Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы,
7-07-0713-01 Інфармацыйныя і кіруючыя сістэмы фізічных установак.

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй. Мова з’яўляецца галоўным інструментам інфармацыйнага ўздзеяння, фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму, ажыццяўлення сацыяльнага ўзаемадзеяння. Асаблівасці сацыялінгвістычнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, павышэнне матывацыі публічнай маўленчай дзейнасці патрабуюць ад вышэйшай школы рыхтаваць не толькі спецыяліста, але і камунікатыўна развітую асобу, білінгвальна падрыхтаваную, якая на дастатковым узроўні можа наладжваць зносіны на нацыянальнай мове ў прафесійна-справавой і навуковай сферах.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» далучае навучэнцаў да сістэмы нацыянальных каштоўнасцей, спрыяе авалоданню на высокім узроўні маўленчай культурай у прафесійных зносінах, садзейнічае лагічнасці, выразнасці, правільнасці і дакладнасці маўлення будучага спецыяліста. У працэсе навучання студэнты авалодваюць спецыяльнай тэрміналагічнай лексікай, вучацца граматна, лагічна і паслядоўна выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах, дарэчна карыстацца моўнымі нормамі ва ўмовах білінгвізму, у залежнасці ад мэтаў камунікацыі працаваць з прафесійна арыентаванымі і навуковымі тэкстамі, весці дакументацыю, выступаць з публічнымі прамовамі і навуковымі паведамленнямі. Авалоданне студэнтамі праграмай вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» будзе спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

# МЭТА, ЗАДАЧЫ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Мэта вучэбнай дысцыпліны: выпрацаваць у будучых спецыялістаў якасныя ўменні і навыкі эфектыўнага выкарыстання моўных сродкаў у прафесійнай камунікатыўнай дзейнасці.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

замацаваць і ўдасканаліць веды па беларускай літаратурнай мове ў яе вуснай і пісьмовай формах;

садзейнічаць выпрацоўцы ўмення арыентавацца ў тэарэтычных і практычных праблемах функцыянавання беларускай мовы;

стварыць цэласнае сістэмнае ўяўленне аб функцыянаванні мовы ў яе стылявых разнавіднасцях;

садзейнічаць фарміраванню і павышэнню культуры маўлення, у тым ліку прафесійнага, будучых спецыялістаў.

дапамагчы выпрацаваць уменні і навыкі самастойнага аналізу моўных з’яў;

спрыяць узбагачэнню слоўнікавага запасу навучэнцаў;

удасканаліць навыкі і ўменні якаснага і дакладнага перакладу спецыяльных тэкстаў з рускай мовы на беларускую і наадварот;

спрыяць выпрацоўцы ў студэнтаў навыкаў правільнага, дакладнага, чыстага, выразнага і разнастайнага маўлення;

сфарміраваць уменне мэтазгоднага выкарыстання сродкаў беларускай мовы ў навуковай і практычнай дзейнасці;

заахвочваць да практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці;

выхоўваць павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, фарміраваць імкненні да перспектыўнага развіцця беларускай мовы;

спрыяць фарміраванню камунікатыўна развітой асобы, здольнай наладжваць кантакты на нацыянальнай мове.

Змест вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» карэлюецца са зместам вучэбных дысцыплін «Замежная мова» (знаёмства з найноўшымі тэхналогіямі, адкрыццямі і тэндэнцыямі ў галіне тэхнікі і інфарматыкі), «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» (фарміраванне і станаўленне беларускага этнасу, нацыі, дзяржаўнасці), «Філасофія» (асветнікі Беларусі).

# ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗРОЎНЮ ЗАСВАЕННЯ ЗМЕСТУ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» фарміруецца наступнная ўніверсальная кампетэнцыя: выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны навучэнец павінен:

*ведаць*:

ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі асобы;

месца і ролю беларускай мовы ў славянскім свеце;

паходжанне і этапы развіцця беларускай мовы, фарміраванне яе графічнай сістэмы;

персаналіі заснавальнікаў беларускай лінгвістыкі;

функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, іх жанравыя разнавіднасці;

спецыфіку сістэмы функцыянальных стыляў беларускай літаратурнай мовы;

асаблівасці фарміравання навуковага стылю;

адметнасці навуковага і афіцыйна-справавога стыляў і сфераў іх прымянення;

структуру лексікі беларускай мовы;

асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай;

сістэму літаратурных нормаў беларускай мовы;

*умець*:

характарызаваць асаблівасці функцыянальных стыляў;

ствараць тэксты розных жанраў, свядома карыстаючыся моўным матэрыялам, адэкватна стылю, мэце, сітуацыі і тэме выказвання;

выкарыстоўваць стылістычныя нормы, згодна з сітуацыяй прафесійных або справавых зносін.

аналізаваць асаблівасці беларуска-рускага і руска-беларускага білінгвізму;

інтэрпрэтаваць моўную палітыку дзяржавы ў гістарычным кантэксце;

аналізаваць моўную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе;

*валодаць навыкамі і ўменнямі*:

эфектыўных маўленчых паводзін у розных сітуацыях прафесійных і справавых зносін;

карыстацца моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці;

адэкватна перакладаць навуковыя, спецыяльныя і службовыя тэксты з рускай на беларускую мову і наадварот, улічваючы стылістычную прыналежнасць і асаблівасці лексіка-граматычнай будовы тэксту;

кампрэсіі і разгортвання навуковай інфармацыі, анатавання, рэферыравання і рэдагавання;

пісьменнага афармлення справавых дакументаў.

У межах адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)" студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асабісты, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, готовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» разлічана на 108 вучэбных гадзін, з іх – 40 аўдыторных. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: практычныя заняткі – 40 гадзін.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Найменне раздзела, тэмы | Усяго аўдыторных гадзін | Практычныя заняткі |
|---|---|---|
| **Раздзел 1. АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ СФЕРА** | **14** | **14** |
| Тэма 1. Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры | 2 | 2 |
| Тэма 2. Сістэмная арганізацыя беларускай мовы | 2 | 2 |
| Тэма 3. Беларуская мова сярод іншых моў | 2 | 2 |
| Тэма 4. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы | 2 | 2 |
| Тэма 5. Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | 2 |
| Тэма 6. Нормы беларускай літаратурнай мовы | 4 | 4 |
| **Раздзел 2. НАВУЧАЛЬНА-ПРАФЕСІЙНАЯ СФЕРА** | **26** | **26** |
| Тэма 7. Лексічная сістэма беларускай мовы | 2 | 2 |
| Тэма 8. Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення | 2 | 2 |
| Тэма 9. Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі | 2 | 2 |
| Тэма 10. Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы | 2 | 2 |
| Тэма 11. Навуковы стыль | 4 | 4 |
| Тэма 12. Кампазіцыйна-структурная арганізацыя тэкстаў навуковага стылю | 2 | 2 |
| Тэма 13. Прыёмы рэдагавання навуковага тэксту | 4 | 4 |
| Тэма 14. Жанры навуковай літаратуры | 2 | 2 |
| Тэма 15. Афіцыйна-спраўавы стыль | 2 | 2 |
| Тэма 16. Культура прафесійнага маўлення | 4 | 4 |
| **Усяго:** | **40** | **40** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ СФЕРА

### Тэма 1. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ЧАСТКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Суадносіны мовы і культуры. Беларуская нацыянальная мова і духоўная культура народа.

Функцыі беларускай мовы як асноўнага кампанента нацыянальнай культуры. Роля вуснай народнай творчасці ў фарміраванні нацыянальных каштоўнасцей. Ідыяматычнасць мовы.

### Тэма 2. СІСТЭМНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Структура беларускай нацыянальнай мовы. Вызначальныя рысы літаратурнай мовы. Тэрытарыяльныя дыялекты. Узроўні моўнага развіцця (фанетычны, арфаэпічны, словаўтваральны, лексічны, марфалагічны, сінтаксічны). Стандарты беларускай літаратурнай мовы (“тарашкевіца” і “наркамаўка”).

Мова і маўленне. Функцыі мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін.

### Тэма 3. БЕЛАРУСКАЯ МОВА СЯРОД ІНШЫХ МОЎ

Генеалагічная класіфікацыя моў. Моўныя сем’і, групы і падгрупы. Месца беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці моў. Асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі. Беларуская мова сярод усходнеславянскіх моў. Параўнанне тэкстаў беларускай, украінскай, рускай, польскай, балгарскай і чэшскай моў. Даўнія і новыя запазычанні з іншых моў у беларускай мове. Вывучэнне беларускай мовы ў рэспубліцы і за мяжой.

### Тэма 4. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Перыядызацыя беларускай мовы. Гістарычны падыход да разумення працэсаў моўнага развіцця. Агульнаўсходнеславянская мова (X-XIII стст.) як пачатак фарміравання пісьмовай мовы беларускай народнасці. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Старажытныя рукапісныя і друкаваныя помнікі на беларускай мове. Лёс беларускай мовы ў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Новая беларуская літаратурная мова XIX - пачатку XX стст. Роля Яна Чачота, Францішка Багушэвіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў працэсе адраджэння беларускай мовы. Гістарычныя назвы беларускай мовы.

Працэсы ўнармавання беларускай мовы: «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча 1918 г., пашырэнне грамадскіх функцый беларускай мовы ў 1920-я гг., Акадэмічная канферэнцыя 1926 г., рэформа беларускай мовы 1933 г., правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі 1959 г. і 2008 г.

Гісторыя графічных сістэм беларускай мовы. Роля беларусаў ва ўдасканаленні кірыліцы. Гісторыя і сучаснасць беларускай лацінкі. Беларускія тэксты, напісаныя арабскай графікай.

Аналіз моўных асаблівасцей тэкстаў, створаных у розныя гістарычныя этапы функцыянавання беларускай мовы.

### Тэма 5. МОЎНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Стан і статус беларускай мовы ў канцы XX - пачатку XXI стст. у Рэспубліцы Беларусь. Сацыялінгвістычныя працэсы. Білінгвізм як аб’ектыўная рэчаіснасць у краінах свету, разнавіднасці і тыпы двухмоўя. Гістарычныя вытокі білінгвізму ў Беларусі. Псіхалагічны, педагагічны, сацыялінгвістычны аспекты білінгвізму. Паняцце моўнай інтэрферэнцыі і яе віды. Праблемы інтэрферэнцыі. Феномен “трасянкі”.

Аналіз сучасных узораў інтэрферэнцыі.

### Тэма 6. НОРМЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Паняцце моўнай нормы. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення.

Марфалагічныя асаблівасці назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў, дзеясловаў. Скланенне прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў. Асаблівасці ужывання прыслоўяў з лічэбнікамі, лічэбнікаў з назоўнікамі. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў ў беларускай мове. Спосабы перакладу дзеепрыметнікаў з рускай мовы.

Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адрозненні ў кіраванні дзеясловаў і выкарыстанні прыназоўнікаў (па, праз, да, паводле, на, з) у некаторых словазлучэннях у беларускай і рускай мовах. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

Асаблівасці перакладу з блізкароднасных моў. Спецыфіка беларускай граматычнай сістэмы і яе трансфармацыя пры перакладзе.

## Раздзел 2. НАВУЧАЛЬНА-ПРАФЕСІЙНАЯ СФЕРА

### Тэма 7. ЛЕКСІЧНАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Паняцце лексікі як упарадкаванага і сістэмнага слоўнікавага складу мовы. Дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Лексіка паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная; безэквівалентная), ступені ўжывання (актыўная і пасіўная), стылістычнай прыналежнасці (стылістычна нейтральная і афарбаваная), сферы выкарыстання (агульнаўжывальная і абмежаванага ўжытку). Сацыяльныя дыялекты (жарганізмы). Спецыяльная лексіка. Разрады спецыяльнай лексікі (тэрміны, наменклатура, прафесіяналізмы). Спецыфіка тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.

Тэндэнцыі ў развіцці лексічнага складу беларускай літаратурнай мовы (інтэрнацыяналізацыя, нацыяналізацыя, пурызм, збліжэнне і адштурхоўванне ў дачыненні да рускай і польскай моў).

## Тэма 8. ТЭРМІНАЛОГІЯ ЯК ВЯДУЧЫ СКЛАДНІК ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ

Паняцце тэрміна. Крытэрыі вылучэння тэрміна. Тэрміналогія і тэрмінасістэма. Месца тэрміналогіі ў лексічнай сістэме беларускай мовы. Працэсы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі. Агульнанавуковая і вузкаспецыяльная тэрміналогія. Спосабы і сродкі ўтварэння тэрмінаў розных галін дзейнасці. Словаўтваральныя паказчыкі тэрмінаў. Варыянтнасць тэрмінаў. Неўласцівыя суфіксы і словаўтваральныя фарманты беларускага тэрмінаўтварэння. Сродкі перакладу тэрмінаў. Адаптацыя запазычаных тэрмінаў у беларускай мове.

Сістэмныя адносіны ў галіне тэрміналагічнай лексікі: тэрміны-полісеманты, тэрміны-сінонімы, тэрміны-антонімы, міжгаліновыя амонімы.

## Тэма 9. ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ І ТЭРМІНАГРАФІІ

Прынцыпы выпрацоўкі навуковай тэрміналогіі ў 1920 - 1930-я гг. Крыніцы фарміравання беларускай навуковай тэрміналогіі. Тэрміналогія розных сфер навукова-прафесійнай дзейнасці (гісторыя фарміравання, асаблівасці выкарыстання на сучасным этапе). Слоўнікі галіновай тэрміналогіі ў XX і XXI стст.

## Тэма 10. ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ СТЫЛІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай мовы. Агульная характарыстыка стыляў беларускай мовы. Тыпалагічныя прыметы функцыянальных стыляў і падстыляў: тэматыка, прызначэнне, моўныя асаблівасці. Стылістыка як тэарэтычная база культуры маўлення.

Спецыфіка размоўна-гутарковага стылю, публіцыстычнага стылю, стылю мастацкай літаратуры. Актуальныя працэсы ў сістэме функцыянальных стыляў. Канфесійны стыль, інтэрнэт-маўленне, стыль рэкламы і піяр-тэхналогій. Узаемаўплыў стыляў ва ўмовах інфарматызацыі грамадства.

Вызначэнне стылявой прыналежнасці тэксту паводле набору тыпалагічных прымет.

## Тэма 11. НАВУКОВЫ СТЫЛЬ

Агульная характарыстыка навуковага стылю і яго падстыляў. Гісторыя станаўлення навуковага стылю беларускай літаратурнай мовы.

Моўная арганізацыя тэкстаў навуковага стылю. Марфалагічныя асаблівасці: абстрактныя назоўнікі, высокая частотнасць назоўнікаў роднага склону; зваротныя дзеясловы; асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў; аўтарскае “мы”. Частотнасць ужывання агульнанавуковых дзеясловаў і іх роля ў сінтаксічных канструкцыях навуковага тэксту. Роля злучнікаў і злучальных слоў у навуковым тэксце. Складназалежныя сказы.

Рубрыкацыя навуковага тэксту. Сродкі апісання аб’екта, прадмета, мэты, задачы, метадаў, высноў, вынікаў даследавання ў навуковым тэксце. Асаблівасці загалоўка ў навуковым тэксце.

Аналіз і пераклад профільных навуковых тэкстаў.

## Тэма 12. КАМПАЗІЦЫЙНА-СТРУКТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ТЭКСТАЎ НАВУКОВАГА СТЫЛЮ

Тыпы навуковага маўлення (апісанне, разважанне, доказ, апавяданне). Тэкстаўтваральныя катэгорыі: цэласнасць, звязнасць, члянімасць, лагічнасць. Завершанасць як асноўная уласцівасць навуковага тэксту. Моўныя сродкі стварэння дакладнасці і лагічнасці. Сродкі сувязі на ўзроўні сказаў, абзацаў, адрэзкаў тэксту (лексічныя паўторы, указальныя і асабовыя займеннікі, пабочныя словы). Сродкі лагічнай сувязі (злучнікі, прыслоўі, пабочныя словы). Паказчыкі ступені аб’ектыўнай навуковай інфармацыі, выражэнне суб’ектыўнай думкі, спасылкі на крыніцу інфармацыі. Афармленне цытат і спасылак у навуковым тэксце.

Словы-дамінанты ў тэкстах розных навук. Паняцце падмовы навукі (інфарматыкі, матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і інш.). Невербальныя сродкі стварэння дакладнасці (графікі, табліцы, схемы).

Этыка навуковых даследаванняў.

## Тэма 13. ПРЫЁМЫ РЭДАГАВАННЯ НАВУКОВАГА ТЭКСТУ

Прынцыпы разгортвання інфармацыі ў навуковым тэксце. Структурна-семантычныя прынцыпы кампрэсіі інфармацыі. Трансфармацыя складаназалежных сказаў у простыя. Адпрацоўка трансфармацыйных прыёмаў кампрэсіі і разгортвання інфармацыі. Выдзяленне асноўнай і дадатковай інфармацыі.

Стылістычныя нормы і камунікатыўныя якасці ў навуковым тэксце. Класіфікацыя стылістычных памылак і спосабы іх выпраўлення. Фарміраванне індывідуальнага стылю навукоўца.

Міждысцыплінарны падыход пры правядзенні навуковых даследаванняў. Узаемасувязь лінгвістыкі і дакладных навук.

## Тэма 14. ЖАНРЫ НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Сістэма жанраў сучаснай навуковай літаратуры. Кампазіцыйна-змястоўная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата, тэзісаў. Структурна-семантычны аналіз анатацый. Віды анатацый. Бібліяграфія і тэкст анатацыі. Лексіка-граматычныя клішэ анатацыі і рэферата.

Складанне анатацый да тэкстаў розных стыляў.

## Тэма 15. АФІЦЫЙНА-СПРАВАВЫ СТЫЛЬ

Асноўныя характарыстыкі афіцыйна-справавога стылю. Групы афіцыйна-справавой дакументацыі (асабістыя, распараджальныя, адміністрацыйна-арганізацыйныя, інфармацыйна-даведачныя, справавыя лісты, фінансавыя і ўліковыя дакументы). Лексіка-граматычныя асаблівасці мовы справавых папер

і службовых дакументаў. Паняцце канцылярскага штампа. Тэкст службовага дакумента. Правілы афармлення дакументаў. Спосабы выкладання матэрыялу ў дакуменце: канстатацыя, паведамленне, апісанне. Суразмернасць частак дакумента.

Прынцыпы афіцыйнага электроннага ліставання.

## Тэма 16. КУЛЬТУРА ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ

Паняцце культуры маўлення. Кампаненты культуры маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, дарэчнасць, чысціня, багацце). Нацыянальная спецыфіка беларускага маўленчага этыкету і культуры зносін.

Прафесійнае маўленне. Прыёмы эфектыўнай публічнай камунікацыі. Узаемадзеянне вербальных і невербальных сродкаў (міміка, жэсты). Выразнасць маўлення (інтанацыя, дыкцыя, паўзы). Асаблівасці маўленчых паводзінаў перад камерай і мікрафонам. Падрыхтоўка да выступлення па відэасувязі.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

### АСНОЎНАЯ

1. Абабурка, М. В. Культура беларускай мовы / М. В. Абабурка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1994. – 121 с.

2. Азарка, В. У. Беларуская мова. Спецыяльная лексіка : вучэбна-метадычны дапаможнік. – 3-е выд., перапрацаванае / В. У. Азарка, А. С. Васілеўская, М. М. Круталевіч. – Мінск : БДПУ, 2007. – 243 с.

3. Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія : фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / А. Л. Антанюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 238 с.

4. Антанюк, Л. А. Беларуская мова : прафесійная лексіка : курс лекцый / Л. А. Антанюк, Б. А. Плотнікаў. – Мінск : Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце РБ, 2004. – 238 с.

5. Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1994. – 653 с.

6. Булахаў, М. Г. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX – XX ст. ва ўзаемаадносінах з іншымі славянскімі мовамі : манаграфія / М. Г. Булахаў. – Мінск : Акадэмія навук БССР, 1958. – 43 с.

7. Буракова, М. У. Беларуская мова. Тэхнічная тэрміналогія : вучэбны дапаможнік / М. У. Буракова. – Мінск : РІВШ, 2016. – 264 с.

8. Дынаміка літаратурнай нормы сучаснай беларускай мовы / навук. рэд. В. П. Русак. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 439 с.

9. Ермаловіч, А. В., Афіцыйна-справавы і навуковы стылі : вучэбна-метадычны дапаможнік / А. В. Ермаловіч, А. В. Шарапа. – Мінск : БДУІР, 2012. – 59 с.

10. Жаўняровіч, П. П. Даведнік па літаратурнай праўцы : арфаграфічны, пунктуацыйны, лексічны, граматычны, сінтаксічны, тэхнічны ўзроўні / П. П. Жаўняровіч. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 447 с.

11. Каляда, А. Беларускае літаратурнае вымаўленне : практыкум па дыкцыі і арфаэпіі / А. Каляда. – Мінск : Тэхналогія, 2006. – 96 с.

12. Красней, В. П. Беларуская тэрміналогія : зборнік артыкулаў / В. П. Красней. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2011. – 215 с.

13. Кулікові́ч, У. І. Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні. Тэсты : даведачны матэрыял / У. І. Куліковіч. – Мінск : Новое знание, 2010. – 126 с.

14. Ляшчынская, В. А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка : вучэбны дапаможнік / В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ БДУ, 2001. – 254 с.

15. Ляшчынская, В. А. Студэнту аб мове : прафесійная лексіка / В. А. Ляшчынская. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2003. – 243 с.

16. Мінакова, Л. М. Беларуская навукова-тэхнічная тэрміналогія : фарміраванне, функцыянаванне, развіццё / Л. М. Ляшчынская, С. М. Аніськова, А. А. Станкевіч. – Гомель : ГДУ, 2004. – 146 с.

17. Плотнікаў, Б. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў. – Мінск : Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – 671 с.

18. Старавойтава, Н. П. Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць : вучэбна-метадычны дапаможнік для нефілал. спец. / Н. П. Старавойтава. – Мінск : БДЭУ, 2006. – 181 с.

19. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Г. У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 173 с.

20. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 293 с.

ДАДАТКОВАЯ

21. Булыка, А. М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV – XVIII ст. / А. М. Булыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 254 с.

22. Германізмы ў беларускай мове / склад. : А. А. Прыгодзіч, М. Р. Прыгодзіч, Г. Генчэль ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. – Мінск : БДУ, 2015. – 302 с.

23. Жаўняровіч, П. П. Стылістыка дзелавога маўлення і рэдагаванне службовых дакументаў / П. П. Жаўняровіч. – Мінск : Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі, 2014. – 275 с.

24. Запрудскі, С. М. Беларускае мовазнаўства і развіццё беларускай літаратурнай мовы : 1920–1930 гады / С. М. Запрудскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 366 с.

25. Запрудскі, С. М. Назвы беларускай мовы ў працах даследчыкаў пачатку XIX ст. // Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе. – Мінск : БДУ, 2013. – С. 81-111.

26. Капейко, Т. В. Лексіка-семантычны спосаб тэрмінаўтварэння / Т. В. Капейко. – Магілёў : МДУ, 2007. – 145 с.

27. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. Ч.1 / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Беларуская навука, 2007.

28. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. Ч. 2/ Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Беларуская навука, 2009.

29. Лексікалогія беларускай мовы ў даследаваннях і каментарыях : дапаможнік / Г. І. Кулеш [і інш.] ; пад агул. рэд. М. Р. Прыгодзіча. – Мінск : БДУ, 2018. – 190 с.

30. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 462 с.

31. Наўроцкая І. В. Крыніцы навуковага стылю беларускай літаратурнай мовы 1920-х гг. // Мова і літаратура : матэрыялы 72-й навук. канф. / пад рэд. К. А. Тананушкі. – Мінск : РІВШ, 2015. – С. 82-87.

32. Першая нацыянальная канферэнцыя «Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі» (Мінск, 4 – 6 мая 1994) : матэрыялы / Рэдкал. : З. Санько (адк. рэд.) і інш. – Мінск : ТБМ, 1995. – 340 с.

33. Прыгодзіч, М. Р. Шчодрасць слова / М. Р. Прыгодзіч. – Мінск : Народная асвета, 1990. – 78 с.

34. Пытанні нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі // Матэр. рэспубл. навук. канф. / [рэдкалегія : Д. Паўлавец (галоўны рэдактар) і інш.]. – Гомель : Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, 1994. – 66 с.

35. Сопоставительное описание русского и белорусского языков. Словообразование / науч. ред. : А. А. Лукашанец, О. М. Николаева. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 485 с.

36. Станкевіч, А. А. Дэтэрміналагізацыя тэрмінаў іншамоўнага паходжання ў сучаснай беларускай мове // Беларуская мова. – Вып. 5. – С. 27-34.

37. Змешанае маўленне, змешаны дыскурс, моўныя тыпы : беларуская і руская мовы і змешанае маўленне ў беларускіх сем'ях / Герд Генчэль, Патрык Цэлер // Роднае слова, 2013. – № 7. – С. 36-40 ; № 11. – С. 29-32 ; 2014. – № 3. – С. 30-33.

38. Мова як сістэма : правапіс у святле камп'ютарна-лінгвістычнага аналізу / [складальнікі : К. Ф. Піскуноў, К. М. Пучынская ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча]. – Мінск : Роднае слова, 2014. – 358 с.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННЮ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя формы самастойнай работы:

выкананне кантрольных работ;

падрыхтоўка пісьмовых рэфератаў і вусных выступленняў па індывідуальных тэмах;

агляды па культуры маўлення праз аналіз перыядычных друкаваных выданняў, радыё-, тэле- і інтэрнэт-перадач;

рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў;

рэдагаванне навуковых тэкстаў;

складанне і выкананне тэстаў;

складанне дыяграм, графікаў, ментальных схем па тэарэтычных пытаннях;

напісанне творчых работ.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТА

Прыкладнымі вучэбным планамі спецыяльнасцей ў якасці формы прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» рэкамендуецца залік. Ацэнка вучебных дасягненняў студэнта ажыццяўляецца па сістэме «залічана/не залічана».

Для бягучага кантролю па вучэбнай дысцыпліне і дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў могуць выкарыстоўвацца наступныя формы:

даклад на практычных занятках;

кантрольныя апытанні;

кантрольныя работы;
тэсты;
рэфераты;
ацэньванне на падставе модульна-рэйтынгавай сістэмы;
справаздачы паводле дамашніх практычных практыкаванняў з іх вуснай абаронай.

## РЭКАМЕНДАВАНЫЯ МЕТАДЫ (ТЭХНАЛОГІІ) НАВУЧАННЯ

Асноўныя рэкамендаваныя метады (тэхналогіі) навучання, якія адказваюць мэтам і задачам вучэбнай дысцыпліны:
інфармацыйна-камунікатыўная тэхналогія;
тэхналогія развіцця крытычнага мыслення;
метады праблемнага навучання;
эўрыстычны метад;
тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці;
праектныя тэхналогіі (пры падрыхтоўцы прэзентацый і паведамленняў);
гульнявы метад (дзелавыя, ролевыя, камандныя гульні);
квэст-тэхналогіі (вэб-квэст);
інтэрактыўныя метады.

Пералічаныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі рэалізуюцца на практычных занятках і пры самастойнай падрыхтоўцы студэнтаў, дазваляюць актывізаваць у навучэнцаў уласныя імкненні да атрымання ведаў, стымуляваць самастойнае вырашэнне вучэбных задач.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ТЭМ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

1. Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры.
2. Сістэмная арганізацыя беларускай мовы.
3. Беларуская мова сярод іншых моў.
4. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы.
5. Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь.
6. Нормы беларускай літаратурнай мовы.
7. Лексічная сістэма беларускай мовы.
8. Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення.
9. Гісторыя і сучаснасць беларускай тэрміналогіі і тэрмінаграфіі.
10. Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы.
11. Навуковы стыль.
12. Кампазіцыйна-структурная арганізацыя тэкстаў навуковага стылю.
13. Прыёмы рэдагавання навуковага тэксту.
14. Жанры навуковай літаратуры.
15. Афіцыйна-справавы стыль.
16. Культура прафесійнага маўлення.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК КАМП'ЮТАРНЫХ ПРАГРАМ, МЕТАДЫЧНЫХ УКАЗАННЯЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ

Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Прыродазнаўства : вучэб. дапам. / пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. І. Куліковіча. – Мінск : Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2015. – 260 с.

Беларуская мова : тэрміналогія фізікі і матэматыкі [Электронны рэсурс]: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі / Д. В. Дзятко, М. К. Чаеўская, А.М. Муравіцкая. – Мінск : БДУ, 2016.